*Грыгаровіч Я.Д., прафесар*

# СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Культура як сістэмная сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам, характарызуе ўзровень развіцця грамадства, супольнасці, нацыі, асобы, з'яўляецца люстэркам сённяшняй іх сутнасці і перспектыў далейшага руху наперад.

Не выпадкова далейшае развіццё інтэлектуальнай, эмацыянальнай, мастацкай, прававой, эканамічнай, бытавой, іншых відаў духоўнай культуры народа, кожнага чалавека лічыцца першаснай умовай сацыяльнай устойлівасці грамадства.

Беларускі універсітэт культуры сёння рыхтуе спецыялістаў у розных галінах культуры: у сферы народнага мастацтва па ўсіх яго відах (музычнае, харэаграфічнае мастацтва, народныя рамёствы, традыцыйныя абрады і святы, фальклор рэгіянальны і аўтэнтычны і інш.), культуралогіі (сусветная і айчынная культуры, менеджмент сацыякультурнай дзейнасці, арганізацыя вольнага часу, выхаваўчая работа ва ўстановах культуры, сацыяльная педагогіка, інфармацыйныя сістэмы ў культуры — папяровыя, электронныя, мультымедыйныя сродкі), а таксама па бібліятэказнаўстве, сацыяльнай рабоце і інш. Адным словам, падрыхтоўка ажыццяўляецца па 12 спецыяльнасцях і 43 спецыялізацыях.

Беларускі універсітэт культуры з'яўляецца адкрытай сацыяльнай і інфармацыйнай сістэмай, якая хутка ўспрымае новыя элементы ў структуры, гатовая да разумных, абгрунтаваных інавацый на аснове класічнай культуралагічнай універсітэцкай адукацыі.

Наш універсітэт актыўна стварае сістэму бесперапыннай адукацыі школа – каледж – універсітэт – магістратура – аспірантура – дактарантура. Сёння ўжо існуе сетка спецыялізаваных сярэднеспецыяльных устаноў, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыхтуюць сваіх выпускнікоў да паступлення ў наш універсітэт. Гэта мінская гімназія – каледж № 24, Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум, выпускнікі якіх паступаюць адразу на трэці курс, ідзе праца над стварэннем агульных вучэбных планаў для комплексаў Гомельскі каледж мастацтваў – Беларускі універсітэт культуры, Мазырскае музычнае вучылішча – Беларускі універсітэт культуры, Пінскі харэаграфічны каледж – Беларускі універсітэт культуры. Створана Мазырская філія, у якой рыхтуюцца спецыялісты па псіхалагічнай рэабілітацыі мастацтвам (для забруджаных тэрыторый).

Адбыліся два выпускі бакалаўраў і магістраў. Выпускнікі аспірантуры паспяхова абараняюць дысертацыі на дзеючых ва універсітэце саветах па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. З 1999 года пачынаецца набор у дактарантуру па пяці спецыяльнасцях. Такім чынам, завяршаецца стварэнне сістэмы бесперапыннай адукацыі.

Універсітэт вядзе шырокую міжнародную дзейнасць, мае дамовы з аналагічнымі універсітэтамі Расіі, Украіны, Польшчы, Францыі, Германіі, Галандыі, ЗША, Даніі і іншых краін свету.

Наш універсітэт займаецца творчай дзейнасцю: звыш 60 мастацкіх калектываў паказваюць сваё майстэрства ў замежных краінах, адкуль прывозяць пераможныя рэгаліі буйнейшых фэстаў народнага і прафесійнага мастацтва Еўропы, Азіі, Амерыкі. Але часцей за ўсё гэтыя калектывы наведваюць раёны роднай Беларусі, у прыватнасці і забруджаныя тэрыторыі Гомельскай вобласці.

Эстрадна-сімфанічны, духавы, народныя аркестры, хары, харэаграфічныя калектывы, знакамітыя ансамблі “Валачобнікі”, ”Грамніцы”, ”Туці”, ”Спадчына” і іншыя ведаюць у многіх кутках нашай краіны. Толькі за снежань-люты на Беларусі было праведзена звыш 50 калядных, навагодніх, грамнічных мерапрыемстваў сіламі нашых студэнтаў.

Мы радуемся магчымасці далейшага развіцця нашай alma mater, у якую ў мінулыя тры гады быў найвышэйшы па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі конкурс. На некаторыя спецыяльнасці ён дасягаў да 10 чалавек на месца.

Нядрэнна ідуць справы ў нашых выпускнікоў і з працаўладкаваннем: у гэтым годзе на 311 выпускнікоў паступіла 466 запытаў з дзяржаўных устаноў. Было накіравана на працу 258 спецыялістаў, 53 выпускнікі атрымалі свабоднае размеркаванне. Як бачым, задаволена толькі частка пададзеных заявак, прычым не былі задаволены нават патрэбы такіх арганізацый, як аддзелы адукацыі, сярэднія спецыяльныя ўстановы, бібліятэкі РНТБ, БДУ, РНМБ і інш.

Такім чынам, ёсць падставы сцвярджаць, што наша ўстанова мае высокі рэйтынг, яна прэстыжная і папулярная сярод беларускай моладзі. Аднак праблемы універсітэта сёння не толькі існуюць, але і набываюць маштабны, а часам і глабальны характар.

1. Як кожны чалавек цікавы сваімі думкамі, памкненнямі, духоўным узроўнем, непадабенствам да іншых, так і кожная дзяржава перш за ўсё цікавая для іншых краін сваімі адметнасцю, непаўторнасцю, ментальнасцю, якія праяўляюцца ў першую чаргу ў культуры. Таму актуальнейшая праблема — стварэнне дзяржаўнай праграмы падтрымкі і развіцця традыцыйнай мастацкай, педагагічнай, бытавой, абрадавай і іншых культур карэннага насельніцтва Беларусі, якая б дазволіла сістэматызаваць і структурызаваць падрыхтоўку кадраў у гэтай сферы.

2. Неабходны цэнтралізаваны выхад на сусветныя інфармацыйныя патокі, у сусветныя глабальныя сеткі, пераход на сучасныя мультымедыйныя сродкі інфармацыі не толькі як карыстальнікаў, але і як носьбітаў інфармацыі пра нашу краіну.

Вельмі балючая праблема ўключэння нацыянальных інфармацыйных сетак у асноўную камунікатыўную артэрыю свету – сетку Інтэрнет. Важна, каб гэтае пытанне набыло дзяржаўны статус, здзейснілася цэнтралізавана. Неабходны стварэнне заканадаўчай базы, прыняцце першачарговых законаў, распрацоўка канцэпцыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі Беларусі. У іншым выпадку сусветныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйныя патокі пойдуць у абход нашай краіны, што адкіне яе на некалькі дзесяцігоддзяў назад. Вырашэнне гэтай праблемы дазволіла б нашай навучальнай установе на якасна новым узроўні рэалізаваць пытанне дыстанцыйнага кіравання вучэбным працэсам, гэта значыць рэфармаванне звыклага нам завочнага навучання.

3. Былы міністр адукацыі Францыі Жак Дэлор у сваёй найвядомейшай "Канцэпцыі сучаснай адукацыі XXI стагоддзя" асноўнымі задачамі вышэйшай школы назваў фарміраванне псіхалагічнай гатоўнасці ў кожнага студэнта да бесперапыннай адукацыі, да пастаяннага самаўдасканалення і самаадукацыі. І не выпадкова ўся Францыя раз у год піша дыктант, пачынаючы з членаў кангрэса і прэзідэнта, што трансліруецца на ўсю краіну. XX стагоддзе — гэта стагоддзе самаадукацыі, і без гэтага не можа быць пастаяннага развіцця асобы.

Цяпер непасрэдна аб асобных праблемах падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культуры на факультэце завочнага навучання.

Асноўным накірункам вучэбнай работы на гэтым факультэце з'яўляецца самастойная работа студэнтаў, што і прадугледжана вучэбным планам. Рада універсітэта, прэзідыум вучэбна-метадычнай рады грунтоўна абмяркоўвалі пытанні арганізацыі самастойнай работы студэнтаў. Ёсць добрыя напрацоўкі на кафедрах сусветнай літаратуры, бібліяграфіі і дакументазнаўства, сацыяльнай педагогікі, гісторыі, філасофіі. Аднак самастойная работа студэнтаў так і не стала асновай іх навучання на факультэце. Асабліва пільнай увагі патрабуюць якасць вучэбнай дзейнасці студэнта, яго ўменні і жаданне авалодаць неабходнымі ведамі і навыкамі практычнай дзейнасці, пошук патрэбнай для гэтага інфармацыі. Таму ўказанаму пытанню ў наступным навучальным годзе будуць удзяляцца асаблівыя ўвага і кантроль.

Разам з названай праблемай трэба вырашыць і праблему кантролю за ведамі студэнтаў, узмацнення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабаванняў да самастойнасці авалодання вучэбнымі прадметамі, пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў.

Дэканат завочнага навучання, кафедры адчуваюць патрэбу ў арганізацыі навучання на аснове сучасных інфармацыйных тэхналогій. З гэтай мэтай і праводзіцца канферэнцыя. Яе праграма сведчыць пра неабходнасць распрацоўкі методыкі і формаў дыстанцыйнага навучання. У сувязі з гэтым перад кафедрамі стаіць задача стварэння эфектыўных дыдактычных сістэм, заснаваных на выкарыстанні такіх формаў і метадаў навучання, якія былі б здольны зрабіць найбольш прыдатнай сістэму завочнай адукацыі. Неабходна на кафедрах стварыць спецыфічныя рабочыя вучэбныя планы і праграмы, распрацаваць вучэбна-метадычныя комплексы.

На наш погляд, вучэбны комплекс павінен складацца з:

— тэксту з кампактным выкладам асноўнага тэарэтычнага курса,
— відэазапісу лекцыі,
— пытанняў і задач для самакантролю,
— кантрольных пытанняў для праверкі ведаў,
— заданняў для іх выканання,
— даведачных матэрыялаў, неабходных для работы над курсам.

Такія комплексы дапамогуць студэнтам-завочнікам у арганізацыі іх самастойнай працы, фарміраванні ўменняў па авалодванні неабходнымі ведамі і навыкамі практычнай дзейнасці, у пошуку патрэбнай для яе рэалізацыі інфармацыі, ва ўдасканаленні прафесійнага майстэрства.

4. Улічваючы вялікую цікавасць да культуралагічнай і мастацкай адукацыі ў краіне, вялікія конкурсы ва універсітэт, неабходна скрупулёзна вывучыць магчымасць адкрыцця ва універсітэце факультэта дадатковай адукацыі на базе вышэйшай адукацыі мастацкага, педагагічнага, гуманітарнага і іншых профіляў. Задавальненне патрэбы насельніцтва ў дадатковай ці другой культуралагічнай адукацыі дазволіць вырашыць не толькі адукацыйныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльныя і псіхалагічныя праблемы, але і павысіць якасць працы ў сістэме культуры, насычанасць устаноў высокапрафесійнымі кадрамі, палегчыць рашэнне праблем занятасці насельніцтва.

Акрэсленыя задачы не з'яўляюцца адзінымі на сённяшнім этапе развіцця універсітэта, але яны значныя і маштабныя на бліжэйшы навучальны год, іх рашэнне дазваляе вызначыць новыя перспектывы будучыні нашай установы.

***Аксюцік М.І.,*** *дацэнт*

## ЭКАЛАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА КУЛЬТУРОЛАГАЎ ВА ЎМОВАХ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Экалагічная праблематыка ў апошні час усё часцей пераходзіць з агульнатэхнакратычных і эканамічных у шэраг сацыялагічных, культуралагічных і псіхолага-педагагічных пытанняў. Агульная напружанасць у адносінах грамадства і прыроды працягвае існаваць і паглыбляцца з кожным днём. Звязана гэта, на наш погляд, з тым, што акцэнты ў сацыяльнай рабоце па-ранейшаму робяцца на вырашэнні канкрэтных экалагічных праблем, а гаворку трэба весці перш за ўсё аб шырокай экалагічнай адукацыі і экалагічным выхаванні насельніцтва. Неабходна пачынаць не з "бяздушных" шкодных тэхналагічных працэсаў, а з экалагізацыі свядомасці іх стваральнікаў, з фарміравання агульнай экалагічнай культуры людзей.

Значную ролю ў экалагічным выхаванні насельніцтва могуць адыграць будучыя спецыялісты-культуролагі (менеджэры сацыякультурнай сферы, сацыяльныя педагогі, рэжысёры масавых свят і інш.), падрыхтоўка якіх ажыццяўляецца ў Беларускім універсітэце культуры. Вялікая колькасць цікавых форм і метадаў дзейнасці ў вольны час дазваляе эфектыўна ажыццяўляць экалагічнае выхаванне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ